**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Намеснік старшыні аргкамітэта
III (абласнога) этапу
рэспубліканскай алімпіяды,
намеснік начальніка ўпраўлення
адукацыі Магілёўскага аблвыканкама
____________С.В.Лявонава
"_3_" лістапада 2011 года

**Комплексная работа**
**для правядзення раённай (гарадской) алімпіяды**
**па беларускай мове і літаратуры**

**10 клас**

***1. Прадоўжыце сказы.***

1. Прымета тэксту, якая дасягаецца, калі ўсе сказы ў тэксце звязаны паміж сабой па сэнсе – гэта ...
2. Прымета тэксту, якая праяўляецца ў тым, што ўсе сказы і часткі тэксту накіраваны на раскрыццё тэмы і асноўнай думкі тэксту – гэта ...
3. Прымета тэксту, якая азначае, што развіццё тэмы і рэалізацыя асноўнай думкі адбываецца з дапамогай падтэм і мікратэм – гэта ...
4. Прымета тэксту, якая праяўляецца ў тым, што элементы зместу размяшчаюцца ў тэксце ў пэўным парадку, па пэўнай схеме, што складае кампазіцыю тэксту – гэта...
5. Прымета тэксту, якая праяўляецца ў камунікатыўнай пераемнасці сказаў – гэта... .

*(Макс. бал – 5)*

***2. Назавіце па два жанры кожнага стылю.***

*Узор: Назва стылю: жанр*

*(Макс. бал – 5)*

***3. У якіх маўленчых сітуацыях ужываюцца наступныя формулы этыкету?***

Бялом табе -
Спорня ў дзяжу -
У печ комам, з печы волам –

*(Макс. бал – 6)*

***4. Аб'яднайце пераблытаныя кампаненты фразеалагізмаў, каб атрымалася іх кананічная форма.***

Лісток надзёнciv, кітайская канцылярыя, божая малатарня, траянскі асёл, адрэзаная рука, добрая грамата, конь паласаты, іскра нябесная, казак маляваны, правая душа, чорт фігавы, чарнільная цаца, ненаежная луста, вольны хлеб, пустая зямля)

*(Макс. бал – 3)*

***5. Якое слова выступае як "чацвёртае лішняе" ў сучасным беларускім лексіконе? Запішыце яго правільна***

Грэцкія крупы, аўсяныя крупы, пярловыя крупы, манныя крупы.

*(Макс. бал – 2)*

***6. Якое слова атрымаецца, калі да прыстаўкі слова адразу далучыць прыстаўку слова* посцілка, *корань слова* мсцівец, *суфікс слова* настолькі, *суфікс слова* дзверцы, *постфікс слова* спадзявацца ?**

*(Макс. бал – 3)*

***7. Расстаўце знакі прыпынку ў сказах і ўкажыце часцінамоўную прыналежнасць слова* адзін.**

1. Пастухі адзін ужо ў немаладых гадах марудлівы і паважны другі намнога маладзейшы порсткі і рухавы няспешна пасоўваючыся за чарадой то сыдуцца разам то зноў разыдуцца ў бакі.
2. Хлопцы якія стаялі каля дуба былі адных гадоў з намі.
3. Паэзія валодае адной дзіўнай уласцівасцю яна вяртае слову першапачатковую свежасць.
4. Адны зоркі ўзрадаваліся першаму марозу бо свяцілі ярчэй чым у цёплыя летнія ночы.

*В.Гардзей*

*(Макс. бал – 5)*

***8. Аб'яднайце прапанаваныя сінтаксічныя канструкцыі ў наступныя віды сказаў:***

***а) складаназалежны сказ;***

***б) складаназлучаны сказ;***

***в) просты сказ.***

На стале ляжала разгорнутая на дваццатай старонцы кніга. Антон яе так і не прачытаў.

*(Макс. бал – 3)*

***9. Ці адпавядаюць прыведзеныя словазлучэнні сінтаксічнай норме? Калі не адпавядаюць, запішыце правільны варыянт)***

1. Разумець і захапляцца паэзіяй.
2. Паважаць і ганарыцца бацькамі.
3. Не варта патураць і цацкацца з лайдакамі.

*(Макс. бал – 3)*

***10. Размяркуйце прыведзеныя творы:***

"Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...", "Зорка Венера ўзышла над зямлёю..." "Варона і чыж", "Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...", "Ёсць чары ў забытым, старадаўным...", "Мне доўгае расстанне з Вамі.... .

***Верлібр:***

***Тэрцыны:***

***Раманс:***

***Санет:***

***Байка:***

***Трыялет:***

*(Макс. бал – 12)*

***11. Закончыце апошнім радком страфу. Каму належаць прыведзеныя словы і пра каго ідзе гаворка?***

Нізка голаў схіляю, юнача,
Перад вечным глаголам тваім.
Смела крочу цяпер у пяскі я
Перад светлай заветнай гарой,
Бо як ёсць у народа такія –
.................................

*(Макс. бал – 3)*